От редакции: Когда верстался номер стало известно, что во вторник вечером вернулся из Минска пропавший было заместитель председателя профсоюза предпринимателей А. Васильев. В среду утром он должен был появиться среди своих коллег. Данный факт мог в корне изменить сложившиеся после переговоров настроения, тем более что Васильев намеревался сообщить гродненским торговцам, что с 5 мая в знак солидарности с ними объявили протест торговцы Минска и других городов Беларуси.

Як у Гародні "здавалі" Радзіму

Працяг. Пачатак на стар.1

Да сейма 1793 г. кіруючыя колы Расіі і Прусіі падрыхтаваліся добра. Праблему караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, які адмаўляўся ехаць на сейм, вырашылі з дапамогай грошай. Расія паабяцала выплаціць усе даўгі караля варшаўскім яўрэям. Гэтага было дастаткова, каб Панятоўскі згадзіўся прыехаць у Гародню. Тыя ж самыя грошы адыгралі галоўную ролю пры выбранні дэпутатаў. Дарэчы, яшчэ загадзя дыпламаты Расіі і Прусіі дамагліся ад урада Рэспублікі прыняцця закона, які адсунуў ад выбараў прыхільнікаў канстытуцыі 3 мая 1791 г., найбольш энергічных абаронцаў незалежнасці краіны. Падчас выбараў агенты Расіі і Прусіі адкрыта куплялі галасы выбаршчыкаў. Пазней гісторыкі падлічылі, што выбаршчык у Беларусі і Літве "каштаваў" у сярэднім 200 рублёў, а ў Польшчы - 400. Тыя, хто ўзяў грошы, галасавалі за дэпутатаў з расійскага і прускага спіскаў. З пункту погляду Расіі і Прусіі выбары прайшлі паспяхова. Вядомых прыхільнікаў суверэнітэту (апазіцыянераў) у сейме не было. Задаволеныя расійскі і прускі ўрады выдзялілі значную суму грошай на арганізацыю банкетаў як дадатковай падзякі для выбаршчыкаў. Гэта была сапраўды "брацкая шчодрасць!" Пакуль выбаршчыкі бавілі час на банкетах, дэпутаты выбіраліся да Гародні.

Сейм распачаў сваю працу напрыканцы сакавіка. Але нечакана для тых, хто "заказваў музыку", выйшла пэўная замінка. Нават купленыя і падабраныя дэпутаты не жадалі выконваць прызначаныя для іх ролі ў спектаклі пад назвай "Гарадзенскі сейм". Магчыма яны разумелі, што гісторыя не сканчаецца сённяшнім днём, што непазбежна наступіць дзень заўтрашні, і нашчадкі назавуць рэчы сваімі імёнамі. Між іншым, здрадніка назавуць здраднікам, і праклёны падзе на ўвесь ягоны род.

Дэпутаты не спяшаліся задавальняць прэтэнзіі Расіі і Прусіі. Зрэшты, Расія ўсё ж такі свайго дамаглася даволі хутка. Цэнтральная Беларусь далучылася да каланіяльных уладанняў расійскіх імператараў. А вось патрабаванні Прусіі сустрэлі значна больш моцны супраціў. Наступіла восень, а пастановы сейма, патрэбнай захопнікам усё яшчэ не было.

Нарэшце, прыйшоў час рашаючага паседжання, якое ўвайшло ў гісторыю пад назвай "нямога". Расія і Прусія прынялі надзвычайныя меры. Многія дэпутаты атрымалі "падарункі" (хабар) ад расійскага і прускага пасолў. Многім паабяцалі ўзнагароды пры ўмове прыняцця адпаведнай пастановы. Некаторых дэпутатаў арыштавалі і вывезлі з горада. У Гародню, якая ўсё яшчэ заставалася горадам Рэчы Паспалітай, былі ўведзеныя расійскія войскі. Жыхарам забаранілі выходзіць на вуліцы. Батальён расійскіх грэнадзёраў з гарматамі запоўніў падворак Каралеўскага палаца. Дэпутаты, якія ішлі на паседжанне, бачылі як у руках артылерыстаў дымяцца запаленыя фіцілі.

Калі дэпутаты занялі свае месцы ў зале паседжанняў Каралеўскага палаца, дзверы зачыніліся, і каля іх стала ўзброеная варта. Афіцэр заявіў, што нікога не выпусцяць пакуль не будзе прынята патрэбная пастанова. У зале ўжо знаходзіліся рускія афіцэры. Генерал Раўтэнфельд выказаў жаданне сесці побач з каралём, бо таму, нібыта, пагражала небяспека.

Гэтае насілле і запалохванне выклікалі абурэнне часткі дэпутатаў. Яны доўгі час проста зрывалі паседжанне. Сакратар сейма, які павінен быў прачытаць праект пастановы аб падзеле краіны, ніяк не мог гэтага зрабіць. Усе спробы пачаць чытанне былі марнымі, бо дэпутаты ўздымалі неверагодны шум. Яны крычалі, свісцелі, пляскалі ў далоні. Усё сціхала, як толькі сакратар сядаў на месца. Усхваляваны генерал звярнуў увагу караля на недапушчальнасць такіх паводзін. Кароль адказаў, што не можа ўказваць дэпутатам, як яны павінны сябе паводзіць. Так мінуў дзень. Увечары генерал загадаў унесці сена ў залу. Маўляў, будзеце тут начаваць, калі не прымеце пастановы. Але нічога не змянілася. У перапынках паміж спробамі сакратара агучыць пастанову, дэпутаты драмалі. Усё скончылася толькі а чацвёртай гадзіне раніцы. Генерал Раўтэнфельд загадаў увесці ў залу салдат. Гэта моцна напалохала прысутных. Сакратар, нарэшце, здолеў дачытаць да канца праект пастановы. Маршалак Беліньскі, адзін з памагатых Расіі, распачаў галасаванне. Адказам на ягоныя заклікі выказаць свае адносіны да пастановы было маўчанне. Трохі пачакаўшы, маршалак не без урачыстасці ў голасе, прамовіў: "Пастанова прынята аднагалосна!" Дэпутаты маўчалі. Гэтым фарсам і закончыўся Гарадзенскі сейм, апошні сейм Рэспублікі.

На наступны дзень некаторыя дэпутаты пратэставалі. Але гэтыя пратэсты зацікавілі толькі гісторыкаў. Справа была зроблена. Па суверэнітэту Рэспублікі быў нанесены амаль смяротны ўдар. З аднаго боку, насілле і грошы, з другога - адсутнасць адзінства, страх, абыякавасць і здрада вызначылі лёс Рэспублікі.



Але ў краіне былі людзі, здольныя не толькі на пісьмовы пратэст. Сапраўдным адказам на гэты гвалт было паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. На жаль, яго падтрымала толькі частка грамадства. Большасць насельніцтва Рэспублікі даволі абыякава ўспрыняла звестку пра канчыну ўласнай дзяржавы. У 1795 г. Рэч Паспалітая перастала існаваць. У тым самым гарадзенскім Каралеўскім палацы апошні кароль падпісаў акт, якім ён адмаўляўся ад улады.

Дзіўна, але гісторыя першай Рэчы Паспалітай на гэтым не закончылася. Дзяржава, якая знікла, галоўным чынам таму, што аказалася непатрэбнай для большасці яе жыхароў, раптоўна адрадзілася ў свядомасці нашчадкаў як ідэя, як мэта жыцця і змагання. Рэспубліка з'явілася як казачная птушка Фенікс з попелу.

Амаль уся гісторыя Польшчы, Беларусі і Літвы XIX - пачатку XX ст. напоўнена няспыннай барацьбой за вяртанне сваёй дзяржавы. Вось асноўныя вехі гэтай барацьбы: паўстанне 1794 г., паўстанне 1830-1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі, паўстанне 1863-1864 гг. Фактычна кожнае пакаленне брала ў рукі зброю, каб вярнуць тое, што продкі маўкліва аддалі ворагу. Колькі ахвяраў унесла гэтая барацьба!

10 сакавіка 1864 г. на Лукішскай плошчы ў Вільні быў павешаны расійскімі карнікамі адзін з кіраўнікоў паўстання Кастусь Каліноўскі. Гэты чалавек не належаў да катэгорыі "маўклівых змагароў". Ён маўчаў толькі на допытах. У ноч перад смерцю асуджаны папрасіў пяро і паперу. Узрадаваныя следчыя далі ўсё, бо вельмі спадзяваліся атрымаць інфармацыю. Але Каліноўскі пісаў не для іх. У сваіх "Лістах з-пад шыбеніцы" ён развітаўся з беларускай зямлёй і пакінуў запаветзварот да беларускага народу. Каліноўскі заклікаў працягваць барацьбу за свабоду, бо без яе ніколі не будзе ў людзей нармальнага чалавечага жыцця.

Ранкам наступнага дня Каліноўскі стаяў пад шыбеніцай. І ў гэтыя апошнія хвіліны жыцця ён быў мацнейшым за карнікаў, мацнейшым нават за смерць. Чыталі прысуд, а асуджаны (былі цвікі, дзе яго вешаюць!) выказваў свае заўвагі. Яго забілі, але яго не зламалі. Адкуль браліся сілы? Можа іх нарадзіла разуменне, што барацьба не скончаная, і ён застанецца ў памяці нашчадкаў як сімвал барацьбы або як дакор сумленню.

У святле падзей XIX - пачатку XX ст. "нямое" паседжанне Гарадзенскага сейма 1793 г. выглядае як сапраўдная трагедыя, можа, з асобнымі элементамі фарсу. А вось стан суверэнітэту сучаснай Рэспублікі, гарантам якога з'яўляецца прэзідэнт, пакуль больш нагадвае фарс з элементамі трагедыі.

Чалавечая гісторыя часам крочыць дзіўнымі шляхамі. Перамогі пэўных палітычных сілаў, якія не ўлічваюць тэндэнцый гістарычнага развіцця альбо ўпарта ігнаруюць іх, заўсёды абарочваюцца паражэннем. Але колькі чалавечых намаганняў, колькі трагічных лёсаў суправаджае непазбежны працэс вяртання да такіх чалавечых каштоўнасцяў, як свабода і незалежнасць! Веданне свайго мінулага павінна дапамагчы нам не наступіць другі раз "на граблі". І будзем спадзявацца, што Гародня больш ніколі не будзе горадам, у якім "здавалі" сваю дзяржаву.

Алесь СМАЛЯНЧУК





НАШ ЗЯМЛЯК МАРЦІН ПАЧОБУТ-АДЛЯНІЦКІ

Не ўсе, мабыць, ведаюць, што імя выдатнага беларускага асветніка і гуманіста, вядомага вучонага Марціна Пачобута-Адляніцкага непасрэдна звязана з Гродна. Нават паходзіць ён з вёскі Саломенка (маёнтак Пачобуддзе), што ў 20 км на поўдзень ад нашага горада. Адметна,што зусім побач - трохі больш за 10 км - вёска Лаша, месца нараджэння славутага акадэміка Я.Ф.Карскага (1861-1931).

Дасюль ад Пачобуддзя захаваўся адзін мураваны дом і некалькі падмуркаў, ды яшчэ шматлікія помнікі сваякоў і нашчадкаў асветніка на могілках у Індуры.

Нарадзіўся Марцін Пачобут-Адляніцкі 30 верасня 1728 г. у збяднелай шляхецкай сям'і. Першапачатковую адукацыю атрымаў у бацькоўскай хаце, дзе і прайшло яго ранняе дзяцінства. Калі хлопчыку споўнілася 10 гадоў, бацькі ўладкавалі яго ў гродзенскі езуіцкі калегіўм, дзе ён правучыўся з 1738 па 1745 год (па іншых дадзеных з 1740 па 1745). У 17-гадовым узросце насуперак волі бацькоў уступіў у ордэн езуітаў і адбыў у Вільні двухгадовы навіцыят. Навучанне працягваў у Слуцкай педагагічнай семінарыі і ў Полацкім езуіцкім калегіўме, дзе займаўся граматыкай, тэалогіяй і філасофіяй. У 1753-1754 гг. вывучаў філасофію ў Віленскай езуіцкай акадэміі (сучасны Віленскі універсітэт). Тут у ім абудзілася дзіцячая цікавасць да зорнага неба і ён на ўсё жыццё захапіўся астраноміяй.

Сярод ліцвінаў - насельнікаў тагачаснай Літвы (сёння гэта Брэстчына, Гродзеншчына і частка Міншчыны), мабыць з паганскіх часоў, ужываліся своеасаблівыя назвы свяцілаў і сузор'яў. Што з паэтычнай дакладнасцю зафіксавана ў славутай паэме Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш" (пераклад Браніслава Тарашкевіча):

***

"Ужо проці месяца зорка адна і другая
бліснула; ужо тысячы, ужо мільён іх міргае.
Кастор з сваім братам Палюксам найболей яснелі,
Калісь у славян празываныя: Лелі й Палелі;
Цяпер жа дзве братнія зоркі інакш ахрысцілі:
Каронай адну, а другую Літвою манілі...
На поўначы свеціцца круг таго зорнага Сіта,
што бог праз яго (гэтак кажуць) прасеяваў жыта,
як з неба кідаў ён для нашага бацькі Адама,
калі праз грахі зачынілася райская брама.
А крышачку вышай свяціўся, к яздзе ўжо гатовы,
дышлом да Палярнае зоркі, там Воз Давідовы...".

Кастор і Палюкс - самыя яскравыя зоркі сузор'я Блізняты і таму вельмі адметна, што іх старажытнаславянскія паэтычныя назвы Лель і Палель мясцовыя жыхары пасля ўтварэння ў 1569 годзе Рэчы Паспалітай змянілі на патрыятычныя Карона (Польшча) і Літва (Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае - ВКЛ). Сітам называлі сузор'е Плеяды, а Давыдаў Воз, відавочна, - Вялікую Мядзведзіцу. А што тычыцца Цмока, то яго абрысы нагадваюць Левіяфана - велізарную рыбу, якой, паводле старажытнаяўрэйскіх вераванняў, павінны былі насыціцца веруючыя... Безумоўна, паэтычнасць і хараство народных і біблейных паданняў, роўна як таямнічасць і прыгажосць саміх нябесных свяцілаў чаравалі і прываблівалі Марціна з маленства. А непасрэднае захапленне астраноміяй як навукай адбылося ў яго пад уплывам беларускага астранома, ураджэнца Дзятлава Тамаша Жэброўскага (1714-1758), які з 1752 г. выкладаў у Віленскай Акадэміі матэматыку і астраномію і пачаў будаўніцтва абсерваторыі па ўласнаму праекту.



Новы замак у Гродне, дзе адбыўся апошні сойм Рэчы Паспалітай (1793) і трэці падзел Рэчы Паспалітай (1795). Тут часта бываў М.Пачобут-Адляніцкі, наведваючы былога вялікага князя літоўскага і караля польскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

У 1755 г. для ўдасканальвання ведаў Марцін Пачобут-Адляніцкі накіраваўся ў Пражскі універсітэт. Вярнушыся на радзіму ў 1756, працягваў займацца тэалогіяй і астраноміяй. У 1761 атрымаў ступень бакалаўра тэалогіі і зноў выехаў за мяжу для праходжання астранамічнай практыкі (абсерваторыі Марселя, Авіньёна і Неапаля). Вынікі яго першых астранамічных назіранняў былі часткова надрукаваны французскім астраномам Э.А.Паліянам у кнізе "Мірны дагавор паміж Дэкартам і Ньютанам" (1763). Некаторы час М.Пачобут-Адляніцкі выкладаў матэматыку, астраномію і грэчаскую мову ў Полацку. З 1764 г. наш зямляк зноў у Віленскай езуіцкай Акадэміі. Спачатку атрымаў тут тытул магістра філасофіі і вольных навук (1764), стаў прафесарам і выкладчыкам грэчаскай і лацінскай моваў, а неўзабаве і астраноміі (у 1766 надрукаваў брашуру аб зацменні Месяца, а у 1767 афіцыйна атэстуецца як каралеўскі астраном). У хуткім часе яго астранамічная дзейнасць набывае сусветную вядомасць. Доказам гэтага з'яўляецца абранне нашага земляка ў 1770 г. сябрам Каралеўскага навуковага таварыства ў Лондане.

А ў 1778 г. ён становіцца сябрам-карэспандэнтам Парыжскай АН. Прычым, ў гэтых навуковых установах да 1789 года ён з'яўляўся адзіным прадстаўніком навукоўцаў з Рэчы Паспалітай.

З 1765 г. М.Пачобут-Адляніцкі быў абсерватарам (узначальваў астранамічную абсерваторыю, якая была пабудавана ў 1753 па праекту Т.Жэброўскага; у 1766 г. завяршыў апрацоўку экстэр'ера абсерваторыі, што дазволіла яму параўноўваць яе з Грынвічскай абсерваторыяй; у 1788 па яго даручэнню архітэктар М.Кнакфус узвёў з паўдзённага боку абсерваторыі асобную прыбудову для вялікага квадранта Рамсдэна). Такім чынам, пад кіраўніцтвам нашага земляка абсерваторыя набыла сусветнае значэнне. Тут вяліся штодзённыя астранамічныя назіранні, фіксаванне становішча планет Сонечнай сістэмы, Месяца, удакладненне элементаў руху нябесных цел, становішча сузор'яў. Адпаведныя запісы з 1769 па 1808 гг. вяліся М.Пачобутам-Адляніцкім і яго вучнямі на французскай мове. Захаваліся яго "Журналы назіранняў" (з 1772 па 1806 гг.: 34 тамы, якія зараз захоўваюцца ў Санкт-Пецярбургскім архіве Расейскай АН).

Марцін Пачобут-Адляніцкі арганізаваў даследванні сонечных плям, даследваў перамяшчэнне камет, вывучаў зацменні кольцаў Сатурна і спадарожнікаў іншых планет, значную ўвагу надаваў вывучэнню сузор'яў Быка і Скарпіёна, астэроідаў.

Найбольшы вынік далі яго спробы вызначыць размяшчэнне Меркурыя: дакладнасць назіранняў нашага земляка дазволіла французскаму астраному Ж.Ж.Лаланду выкарыстаць іх пры складанні новых астранамічных табліц.

Пасля зліквідавання ордэна езуітаў у 1773 г. пачала працаваць Адукацыйная камісія, якая пераняла ад ордэна кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі, у тым ліку і Віленскай акадэміяй. Секулярызацыя Акадэміі і яе перабудова ў Галоўную школу ВКЛ, пачатыя ў 1773 г., стварылі прадумовы адкрыцця фізіка-матэматычнага факультэта і астранамічнага аддзяленняў (1774-76), а пазней (1780-81) медычнага і прыродазнаўчага факультэтаў. Як член Адукацыйнай камісіі наш зямляк шмат зрабіў для арганізацыі і фінансавання астатняга, у тым ліку пераводу выкладчыкаў, студэнтаў, абсталявання і бібліятэкі з Гродзенскай медычнай школы (акадэміі). Вядома, што наконт гэтага ён вёў перамовы з яе кіраўніком Ж.Э.Жыліберам у Гродна.


У 1780 г. наш зямляк становіцца рэктарам віленскай езуіцкай Акадэміі. На гэтай пасадзе ён разгарнуў самую разнастайную арганізацыйную, навуковую і асветніцкую дзейнасць. На пачатку 1781/1782 навучальнага года рэктар М. Пачобут-Адляніцкі ў сваёй афіцыйнай прамове абвясціў аб рэарганізацыі Акадэміі ў Вышэйшую школу ВКЛ і аб увядзенні медычнай спецыяльнасці (у 1797 г. Вышэйшая школа ВКЛ была перайменавана ў Віленскую Галоўную школу).

М.Пачобут-Адляніцкі - заснавальнік астранамічнай школы. Сярод яго вучняў знакамітыя астраномы Я.Снядэцкі, А.Стрэцкі, М. Глушневіч, П. Смыслоў, В. Карчэўскі). Падтрымліваючы ідэю мноства сусветаў, падзяляючы гіпотэзу аб іх планетнай будове, ён фактычна лічыў правільнай распрацаваную Мікалаем Капернікам геліяцэнтрычную сістэму будовы свету, прымаючы адначасова ўдзел у дыскусіях па вызначэнні паняцця "Бог".

Пра навуковую каштоўнасць астранамічных даследванняў школы М.Пачобута-Адляніцкага Ж.Ж.Лаланд напісаў у сваёй кнізе "Астранамічная біяграфія разам з гісторыяй атраноміі, ад 1781 да 1802" (1803), дзе, у прыватнасці, адзначыў адкрыццё Марцінам Пачобутам-Адляніцкім новага сузор'я Цяльца Панятоўскіх (хутчэй за усё - зорнай асацыяцыі, але на той час гэтага паняцця яшчэ не было).

9 жніўня 1773 г. М.Пачобут-Адляніцкі разам з Ю.Міцкевічам і А.Стжэцкім зрабілі ў "Журнале назіранняў" запіс пра дзесятак новых, "дастаткова прыгожых зорак": "Шчыт Сабескага, які ззяе побач з іншымі зоркамі абуджае ў нас жаданне на прыкладзе вялікага польскага астранома аддаць належнае славе нашага гасудара." І называюць самую яскравую зорку новага "сузор'я" Цялец Каралеўскі). Гэтае адкрыццё было зацверджана Парыжскай АН у 1778 і ўключана ў каталаг Фламстэда.

У 1793 годзе Марцін Пачобут-Адляніцкі арганізаваў даследванні сонечнага зацмення адразу ў некалькіх кропках зямнога шару: Вільні, Варшаве, Кракаве і інш. Разам з Янам Снядэцкім (1756-1830), на той час прафесарам Кракаўскага ун-та (пазней, у 1807-1815 гг. рэктар Галоўнай школы ў Вільні), назіраў зацменне Сонца ў Аўгустова - загараднай рэзідэнцыі Станіслава Аўгуста Панятоўскага пад Гродна (зараз гэта раён вуліц Вольгі Соламавай і Рэпіна). Пры гэтым былі вызначаны геаграфічныя каардынаты Гродна. Вынікі іх працы надрукаваны пад назовам "Разлік Гродзенскіх назіранняў зацмення Сонца, які быў праведзены Пачобутам і Снядэцкім 3 верасня 1793 года".



Загарадная рэзідэнцыя Станіслава Аўгуста Панятоўскага Аўгустова (чарцёж галоўнага фасада). Не захавалася.

Напярэдадні зацмення наш зямляк напісаў спецыяльныя працы па тлумачэнню сонечных зацменняў, руху планет, распавёў пра выкарыстанне матэматычных метадаў у астраноміі.

Трэба адзначыць, што сонечнае зацменне 1793 года адбывалася пад час бадай што самых драматычных падзей, звязаных з апошнім соймам Рэчы Паспалітай, які адбываўся ў Гродзенскім Новым замку. Якраз за тыдзень да гэтага, 2 верасня, начальнік расейскага гарнізона ў Гродне атрымаў загад захапіць выхады з гораду і галоўныя вуліцы, акружыць салдатамі Новы замак, а 24 верасня ў 3 гадзіны 30 хвілін ночы пры ўсеагульным "мёртвым" маўчанні паслоў Сойма быў зацверджаны другі падзел Рэчы Паспалітай.

М.Пачобут-Адляніцкі адкрыў у Вільні 4-хгадовую школу падрыхтоўкі настаўнікаў і выпрацаваў праект "Таварыства літаратаў у Вільні", які даслаў каралю 22 верасня 1773 г. У тым жа годзе распрацаваў праект заснавання ў Вільні таварыства накшталт Акадэміі навук, які прадугледжваў развіццё як фундаментальных тэарэтычных канцэпцый, так і канкрэтных ведаў у галіне геаметрыі, механікі, земляробства, анатоміі і іншых навук.

У 1794 г., пад час паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, наш зямляк быў сябрам Часовага рэвалюцыйнага ўрада Літоўскай правінцыі.

Вядомы ён і як аўтар класічных одаў. Так, на адкрыццё Галоўнай школы ім была напісана ода, у якой асноўнымі ўмовамі развіцця грамадства названы ўсямернае развіццё асветы і навукі і адмаўленне ад разбуральных войнаў. Яго імем названы кратэр на адваротным баку Месяца. У міжваенны перыяд у Гродна была вуліца Пачобута (зараз вул. Стаханоўская, што паміж вул. Касцюшкі і Мендзялеева).



Былы кляштар езуітаў у Гродне, у якім месціўся езуіцкі калегіум, дзе вучыўся М. Пачобут-Адляніцкі

Зараз тэрыторыя гродзенскай турмы, у якой палітычны вязень (1927-30 гг.) Браніслаў Тарашкевіч пераклаў "Пана Тадэвуша" на беларускую мову

З фотаздымку 1885 г.

Аб Марціне Пачобуце-Адляніцкім нагадвае Адам Міцкевіч у паэме "Пан Тадэвуш".

Кніга восьмая "Наезд" (пераклад Б.Тарашкевіча):

***


"...І я астраноміі слухаў два лета
У Вільні; Пузыніха, мудра й багата кабета,
даход свой з сяла аддала, блізка дваста штось хатаў,
на закуп тых шклоў, тэлескопаў і розных прыладаў;
тады абсерватарам быў ксёндз Пачобут, муж слаўны,
астронам і рэктар усёй акадэміі спраўны,
у канцы ж тэлескоп свой пакінуў і катадру тую,
вярнуўся ў кляштар, у цэлю манаску ціхую
й памёр там прыкладна. Я знаюся тож із Снядэцкім,
і ён чалавек дужа мудры, хаця сабе й свецкі."

Памёр Марцін Пачобут-Адляніцкі 20 лютага 1810 года ў Дынабургу (зараз Даўгаўпілс, Латвія).

Алесь Госцеў

Усе здымкі з асабістых збораў аўтара





Марцін Пачобут-Адляніцкі. Літаграфія Грэн'ера з партрэта, які захоўваецца ў археалагічным музеі Вільні.

Ян Снядэцкі.Гравюра на медзі Антона Аляшчынскага (1830) па малюнку Б.Клембоўскага.

1 красавіка 1999 года споўнілася 420 гадоў Віленскаму універсітэту, які быў створаны загадам Стэфана Баторыя 1.04.1579 г. як езуіцкая Акадэмія.

Дорогие ветераны!
От всего сердца поздравляем вас с Днем Великой Победы!

На здымку: А.Папоў з жонкай Надзеяй Іванаўнай і школьнікамі каля памятнай дошкі баявога сябра У.Шчогалева.

Мы памятаем...

У горадзе Скідалі адна з вуліцаў носіць назву Героя Савецкага Саюза, камандзіра знішчальнай эскадрылі 162 авіяпалка, капітана У.Г.Шчогалева, які загінуў у баях за вызваленне Гродзеншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На адным з будынкаў па вуліцы, якая носіць імя героя, устаноўлена мемарыяльная дошка. Сюды, да гэтай памятнай дошкі, штогод прыязджае баявы сябра У.Шчогалева - Андрэй Ягоравіч Папоў з горада Ліды, каб ушанаваць ягоную памяць. Пастаяць моўчкі ля брацкай магілы, ускласці жывыя кветкі.

У 1940 годзе Андрэй Ягоравіч скончыў медвучылішча і займаўся ў аэраклубе. Марыў аб мірнай прафесіі медыка, але лёс павярнуўся інакш.

- Да нас у вучылішча, - успамінае Андрэй Ягоравіч, - прыехалі інструктары з мэтай праверкі паветранага пілатажа. Сярод лепшых аказаўся і я. Так і патрапіў у знішчальную авіяцыю. На фронце сустрэўся з Уладзімірам Георгіевічам у 162 авіяпалку. За гады вайны зрабіў 150 баявых вылятаў, правёў 36 паветраных баёў, асабіста збіў сем варожых самалётаў і тры ў групе.

За мужнасць і гераізм Андрэй Ягоравіч быў удастоены многіх дзяржаўных узнагарод. Дзень перамогі сустрэў у шпіталі. У адным з паветраных баёў пад Беластокам быў цяжка паранены ў нагу.

Час імкліва ідзе, але тыя гады ліхалецця ніяк не знікаюць з памяці...

І.БАРЫСАЎ

"Я жыву для іх"

"Аднойчы мне прысніўся сон. На тым месцы, дзе калісці стаяла царква Еўфрасінні Полацкай, у балоце тапілася мядзьведзіца, вакол якой бегалі яе маленькія дзеткі. Потым, у сне, я ўбачыла іх у сваім ложку... ". Крыху пазней Галіне Снопка патлумачылі сэнс гэтага сна: гадаваць ёй чужых дзяцей...

З гэтай гісторыі пачынаецца наш аповяд пра адзін з незвычайных дзіцячых дамоў на Гарадзеншчыне - дом сямейнага тыпу.

Тая атмасфера, у якой мы апынуліся, пераступіўшы парог гэтай кватэры, не выклікае аніякіх асацыяцыяў з поўнымі слёз вачэй дзетак, якія ўвесь час чакаюць тую жанчыну, якую назваць Мамай.

Апеку над першымі трыма дзяцьмі Галіна Іванаўна Снопка аформіла яшчэ ў 1992 - м годзе.

- Так здарылася, што лёс мяне зводзіў з дзеткамі з дзіцячых дамоў,- распавядае сп.Галіна, - сэрца разрывалася, гледзячы на іх.

Чаму я іх узяла? Не магу растлумачыць. Гэта, напэўна, мой лёс, наканаваны Богам. І я ніколі не шкадавала, што прыняла такое рашэнне. Я шчаслівая, што маю гэтых дзетак.

Наша жыццё складалася тады вельмі цяжка: тры гады мы (сп. Галіна, двое яе уласных дзяцей і дзеткі прыемныя) жылі ў кватэры плошчай 14 квадратных метраў. Калі ж з'явіліся яшчэ двое дзяцей, жыць у такіх умовах стала проста немагчыма. Я даведалася, што з 5-ю прыёмнымі дзеткамі можна адчыніць дзіцячы дом сямейнага тыпу. Рэалізаваць задуму дапамог гарадскі аддзел адукацыі - дзякуй яму за гэта! Так мы адтрымалі нашу 6-пакаёвую кватэру.

У 1998 годзе Галіна Іванаўна ўзяла сабе яшчэ двух дзяцей з дзіцячага дома ў Панямуні. Зараз у яе іх дзевяцера. Сэрца сціскаецца ад радасці за жанчыну, якую з усіх бакоў абдымаюць яе дзеці.

- Дзе Вы бярэце сілы, каб гадаваць столькі дзяцей? - запыталі мы Галіну Іванаўну.

- Зараз мне сорак два гады. Калі б было трыццаць тры - узяла б, напэўна, яшчэ сямера дзетак. Я, нават, і не ўяўляла, што люблю дзяцей. Не ведаю, хто каму больш патрэбны: я ім, альбо яны мне. Дзякуючы ім я зараз адчуваю такі спакой на душы...

- Якая ў Вас самая запаветная мара?

- Каб усе дзеткі на зямлі мелі свой дом, бацькоў і жылі ўсе разам ў міры. Ну, а што наконт маіх дзяцей, то я мару, каб яны ўсе выраслі, ажаніліся, нарадзілі сваіх дзетак і мяне не забывалі, прыходзілі з унукамі...

Лілія АСАКОВІЧ
Таццяна РУСОЎСКАЯ
(Школа маладога журналіста).

ТАСИС нам поможет?

В прошлом году Гродненская область стала центром реализации международного проекта "Региональное развитие и охрана окружающей среды в еврорегионе "Неман", который финансируется в рамках Программы ТАСИС Европейского Союза по трансграничному сотрудничеству. Получатель технического содействия - Гродненский облисполком, общий бюджет проекта - 1миллион ЭКЮ, а срок реализации - 22 месяца. Выбор Гродно и Гродненской области для реализации такого проекта сделан не случайно. Гродненская область и граничащие с ней регионы Польши и Литвы обладают богатым потенциалом для развития туризма, оздоровительного отдыха и санаторно-курортного лечения.

Наибольший интерес представляет район Августовской (РП) и Гродненской (РБ) пущ, которые входят в полосу поозерий, протянувшихся параллельно Балтийскому побережью по территории Польши, Беларуси, Литвы, Латвии, Эстонии и России. На территории Гродненской области сформирована развитая сеть особо охраняемых природных территорий. Они представлены парком "Беловежская Пуща" и 13 заказниками общей площадью 119,5 гектаров.

Подрядчик проекта консорциум из трех фирм, во главе которых английская фирма по управлению природными ресурсами "ERM". Под ее руководством создано семь рабочих групп: историко-культурного наследия, туризма и оздоровления, охраны природы и др. В рабочие группы входят наши специалисты, которые собирают необходимые для анализа сведения и предоставляют подрядчикам проекта. К 1 сентября 2000 года фирма "ЕРМ" должна будет предоставить Гродненскому облисполкому документы проекта регионального планирования.

С точки зрения местных специалистов проект "Региональное развитие и охрана окружающей среды" имеет только теоретический характер. Не известно, согласятся ли местные специалисты с результатами иностранных коллег. Возможно, проект изучат и отвергнут из-за дороговизны или какой-нибудь другой причины. Нет гарантии, что хоть один из пунктов будет реализован на практике. Если местные власти не смогли найти средств на разработку проекта, то откуда потом возьмутся деньги на его реализацию. Очевидно, местные власти предполагают, что для нашего регионального развития инвестиции сделают иностранцы.

Разговоров вокруг проекта немало. Тем не менее, на сегодняшний день фирма "ЕРМ" выполнила только организационный этап: оборудован офис, куплена оргтехника, машина и сформированы кадры. Разумеется, на это потрачена часть денег из 1миллион ЭКЮ. Как будут расходоваться остальные?.. Это, наверное, известно только самим подрядчикам, а они не хотят делиться такой информацией. Точно известно, наши специалисты все необходимые данные должны предоставлять бесплатно. Это вызывает недовольство, потому что, по мнению местных ученых, запрашиваемая информация требует дополнительных исследований, на основании которых можно писать целые диссертации. Для анализа иностранным специалистам необходимо знать точные границы обитания редких животных, насекомых и т.д., их численность в регионе, республике, Европе и мире. Запрашиваются данные о наличии у нас полезных ископаемых и прочих природных ресурсов. Сбором этих данных иностранцы заниматься не будут. Их дело изучать и анализировать. Поэтому если нам нужен проект регионального развития и охраны придется похлопотать и самим.

О.ВИКТОРОВА

Ён вучыць не па-савецку

Нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Сярэднія Печы Гомельскай вобласці. У 71-м годзе скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчаму мастацтву. У 1976 годзе скончыў Беларускі Дзяржаўны Тэатральны Інстытут і прыехаў працаваць у Гродна. З 85-га - член Саюза мастакоў. З 91-га па 96 год працаваў прафесарам кафедры выяўленчага мастацтва ў Гродзенскім універсітэце. Цяпер выкладае ў Вучылішчы мастацтваў. Удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных мастацкіх выставаў.

Я добра памятаю ўрокі малявання ў савецкай школе. Нам давалі тэму "Дзень савецкай канстытуцыі" - і ўсе малявалі дэманстрацыю. На 23 лютага модна было рабіць маленькія танкі з пачакаў на запалкі ды абклейваць іх зялёнай паперай. Карацей, тэмаў было колькі хочаш: Дзень касманаўтаў, 8 сакавіка, Дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча... Адзнакі выстаўлялі адпаведна з такім крытэрыем: прыгожа - "5", не вельмі прыгожа - "4", зусім не прыгожа - "3", нічога не намаляваў - "2". Пасля заняткаў усіх выганялі ў калідор з крыкам "Кто уронил хоть каплю краски на парту, будет мыть весь кабинет!"

На жаль, зараз сітуацыя мала змянілася, калі не лічыць, што мы не святкуем дзень нараджэння Ільіча. Але менавіта ўрокі малявання, а пасля - урокі гісторыі ўплываюць на фармаванне светаўспрымання маленькай асобы. Някепска было б рэфармаваць сістэму адукацыі, аднак у нашых умовах пра такія змены можна хіба што толькі марыць. Бацькі, якія не абыякава ставяцца да развіцця сваіх дзяцей, знайшлі іншае выйсце. Вучні з восьмай і першай школаў ходзяць на ўроках у майстэрню да Мікалая Бандарчука - гродзенскага мастака. З ім мая гутарка.

- Раскажыце, чым займаюцца дзеці ў вашай майстэрні.

- Яны малююць фарбамі - акварэллю ды гуашшу. Я даю ім нейкую тэму, аднак не прымушаю - кожны можа маляваць, што захоча. Падчас іх працы я расказваю ім пра палітру, пра мастацкія жанры. Цяпер кожны з іх ведае, што калі сінюю фарбу змяшаць з жоўтай, дык атрымаецца зялёная. А як дадасі яшчэ чырвонай - будзе карычневая. Стараюся распавесці нешта з гісторыі. Заняткі праходзяць на беларускай мове.

- Ці вы ходзіце разам на выставы?

- Так, памятаю ім вельмі спадабаліся карціны Шчамялёва. Надзвычай яскравыя колеры. Дзеці таксама добра запомнілі асноўныя мастацкія жанры, бо я апавядаў і адначасова паказваў, дзе намаляваны пейзаж, дзе нацюрморт, а дзе эцюд.

- Вы падзяляеце сваіх навучэнцаў на групы паводле здольнасцяў?

- Не. Я лічу, што няма дзяцей, якія не ўмеюць маляваць. Галоўнае знайсці падыход, дапамагчы кожнаму раскрыць свае здольнасці.

На ўроку вызначылі тэму - казачныя героі. Класічныя казкі пра калабка і сямёра казлянят цяпер ніхто не чытае. На пытанне, хто чытаў казкі Пушкіна таксама ніхто не падняў руку. Дзецям найбольш падабаюцца героі імпартовых мультфільмаў. Нехта вырашыў намаляваць дыназаўра.

- А вы ведаеце, чаму дыназаўры вымерлі? - пытаецца Спадар Бандарчук.

- Таму што есці не было чаго.

- Не, таму што стала халодна, і на вадзічцы, дзе яны купаліся, з'явіўся лёд.

Пасля разгаварыліся пра Гродна. Дзецям вельмі падабаецца наш горад. Адна дзяўчынка сказала, што ў нас "каля цэнтральнага магазіна ёсць вялікі белы дом, а каля яго - людзі на кані". Праз колькі хвілін мы здагадаліся, што мова ідзе пра Драмтэатр.



- У нас шмат прыгожых касцёлаў і цэркваў, - кажа спадар Мікалай. - А хто ведае, чым адрозніваецца касцёл ад царквы?

- У касцёл польскія людзі ходзяць, а ў царкву - праваслаўныя, - адказала дзяўчынка, што нядаўна прыехала да нас жыць з Украіны. - А яшчэ ў касцёле такія шкуркі даюць, як чыпсы. На пытанне, якія назвы маюць нашыя касцёлы, усе ўзгадалі Фарны - "той, што каля турмы".

- А хто скажа, чаму Францысканскі касцёл так называецца?

- Можа таму, што ён французскі?

Пасля ўрока дзеці папрасілі паставіць ім адзнакі.

- А на працягу якога часу яны будуць хадзіць да вас?

- Пакуль я планую весці заняткі да 4-га класа. А пасля - хто захоча - будзе займацца і далей. Тады я буду выкладаць для іх асновы скульптуры, жывапісу, малюнку ды кампазіцыі. Карацей, заняткі будуць больш сур'ёзныя.

- Скажыце, чаму вы згадзіліся займацца з дзецьмі?

- Для мяне заўсёды было загадкай, чаму ў школе ўсе прадметы выкладаюцца прафесійна, а выяўленчае мастацтва - не. Праз гэта ў дзяцей фармуецца чыста інфармацыйнае стаўленне да свету. Яны не ўмеюць аналізаваць падзеі. Я хачу дапамагчы ім. Збіраюся таксама напісаць дапаможнік для настаўнікаў, што выкладаюць маляванне ў школе.

Для таго, каб паплыць, трэба ўвайсці ў рэку. Для таго, каб палюбіць свой край трэба яго пазнаць. А пазнаць яго можна таксама і праз мастацтва.

- У вас ніколі не было жадання рэфармаваць сістэму навучання?

- Я лічу, што адносіны да выкладання выяўленчага мастацтва ў школе трэба змяняць кардынальна. У выніку рэфармавання школьнай адукацыі павялічваецца тэрмін навучання. Адносна якасці выкладання - амаль ніякіх зменаў. Нават кабінетаў для заняткаў маляваннем няма амаль нідзе.

- А як наконт вышэйшай адукацыі?

- Была ідэя стварэння Факультэту прыгожых мастацтваў у нашым універсітэце, дзе выкладалі б музыку, літаратуру і маляванне. Была таксама спроба ўвесці навучанне асновам выяўленчага мастацтва на розных факультэтах.

- Навошта?

На жаль, часцей за ўсё чалавек, які атрымлівае дыплом ВНУ, у сваім разуменні мастацтва застаецца на школьным узроўні. Пра якую інтэлегенцыю тут можна гаварыць? Я лічу таксама, што маляванне прыдасца. Батанікі павінны ўмець замалёўваць расліны для гербарыю. Юрыстам прасцей будзе скласці партрэт злачынцы падчас апытання сведкаў.

Гутарыла
Інга АСТРАЎЦОВА

СУПЕРМАРКЕТ

ПРОДАЮ

■ блок/стенку Берестье, тахту, все б/у.
Тел.39-92-24.

м/м в ассорт. у/диваны 3-2-1,2-1-1, кровати. Доставка, гарантия. Тел. 44-33-42, 31-42-30.

■ сейф металлический.
Тел. 72-02-35.

оригинальные кровати и матрасы к ним. Тел. 31-42-30, 44-33-42.

■ женские кашемировые пальто в ассортименте, р-р 46-46.
Тел. 6-65-31.

АВТОРЫНОК

Продаю

■ Ниссан-Блюберд 89 г.
Тел. 63691.

■ Продаю W-Джетта 88г. V 1,3.
Тел. 5-12-35.

■ Срочно продаю Форд-Сиерра XR4I Спорт 83г.V 2,8 Р 160 2,6 у.е.
Тел. 443048 после 17, с 09 ч -17 ч, тел. 448083 Володю.

■ Продам з/ч для БВМ-320 82 г. и мотоцикл ИЖ-Юпитер-5 91 г.
Тел. 33-57-95.

продаю з/ч к груз. тягачу ивеко 190-36 TURBO/START. Тел. 44-33-42 31-42-30.

■ ВАЗ-21053 1995 г.в., 5-ступ. КПП, v-1,6, фаркоп.
Тел. 72-02-35 в раб. время.

■ ФВ-Пассат 1990 г.в., 2,1, бензин, 5 КПП, гидроусилитель, зл. люк, новая резина - 3750.
Тел. 74-17-74, 39-45-61.

■ автосигнал., установка, гарантия, качество.
Тел. 6-65-31, 2-24-08.

■ М-21 "Волга" 1964 г.в.,
Адрес: д.Казимировка, ул.Молодежная, 1.

НЕДВИЖИМОСТЬ

Продаю

■ Продаю 2-х ком. кв. в центре города с тел.
Тел. 5-12-35.

■ 2-х комн. кв. н/п 5/5, Лиможа 36-79.
Тел. раб. 75-15-91.

дачу для отдыха в прекрасном месте. Тел. 390264.

■ дачу д.Плебанишки.
Тел. 6-57-34 с 17.00.

срочно дачу дешево. Тел.750146

Сниму

■ Молодой человек снимет комнату.
Тел. 31-80-73.

КУПЛЮ

■ РЕЛЕ РЭС-9,10; резистор ПП-3.
Тел. 31-80-40.

РАЗНОЕ

Если вы собрались делать ремонт, значит, вам нужен клей Атлас (универсальный). Цены приятно удивят. Расфасовка 25 кг. Тел. 72-06-54 с 9.00 до 18.00.

■ Похудеть - можно! Бесплатные образцы. Консультация. Запись по
Тел. 8-017 2108898.

Дворец культуры химиков проводит набор на трехмесячные курсы парикмахеров. Организационное собрание 17 мая в 9.00 и 18.00. Набор дошкольников до 4-5 лет по подготовке к школе, собрание родителей 27 мая в 18.00. Справки по тел. 2-55-21, 74-19-13.

■ Девушки ищут в/о работу.
Тел. 31-33-26.

Пригоню на заказ а/м ВАЗ любой марки в течение недели.
Тел. 33-79-96.

